Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ

# УЗЯЦЬ НОВЫЯ ВЫШЫНІ

Новых герояў шукае і не знаходзіць, і не можа знайсці буржуазная літаратура Усхода і Захада. Злодзей, жулік, брадзяга, розных масцей авантурысты - такі небагаты асартымент "гераічных" фігур буржуазіі сучаснай эпохі.

Лепшыя прадатаўнікі зарубежных пісьменнікаў, якія прыехалі ў Савецкі Саюз, з вялікай трыбуны гістарычнага нашага з"езда, з хваляваннем ад радасці і захаплення магутным нашым росквітам, заяўлялі, што толькі ў сацыялістычнай радзіме створаны ўсе ўмовы для развіцця творчых сіл чалавека, для прагрэса навукі, літаратуры і мастацтва.

Усесаюзны з"езд савецкіх пісьменнікаў паказаў, якія багатыя і слаўныя рэвалюцыйныя перспектывы адкрываюцца перад мастаком слова, творцам вялікага вобраза будаўнікоў новага ладу жыцця, перад "інжынерамі чалавечых душ" эпохі Сталіна.

З"езд паказаў усяму свету крававанне новай сацыялістычнай культуры і гэта новая культура сацыялізма загаварыла магутным голасам у дакладзе Аляксея Максімавіча Горкага, у дакладах аб літаратуры брацкіх рэспублік, загаварыла магутнай сілай інтэрнацыянальнага адзінства, сілай пралетарскай дружбы народаў на славу партыі бальшэвікоў.

Пісьменнікі прышлі на свой выдатны з"езд з вялікімі творчымі поспехамі, маналітна спаяныя аднымі задачамі, адной

імклівасцю. Гэтае адзінства мэты, глыбока і кроўна ўсвядомленае пісьменнікамі ўсіх народаў СССР, падкрэслівае велізарнае значэнне з"езда, як дэманстрацыі адданасці шырокіх мас савецкай інтэлігенцыі ідэям сацыялізма, як яркі ўзор перамог генеральнай лініі партыі.

Гарачай любоўю, глыбокай пашанай і выключнай клапатлівасцю атулены песняры народаў Савецкай зямлі. Гэтую любоў яны заваявалі таму, што мастацкая літаратура ўжо з"яўляецца вялікай зброяй у руках камуністычнай партыі і рабочага класа, таму, што мастацкая літаратура ўжо многім узбагаціла культурнае жыццё працоўных.

Але які яшчэ складаны адказны і пачэсны шлях ляжыць перад савецкім пісьменнікам! Колькі яшчэ новыя вялікіх твораў, новай вялікай якасці чакае наша краіна! І яна - наша сацыялістычная краіна - робіць выключна ўсё, каб забяспечыць далейшы бурны рост мастацтва. "Не было і няма ў свеце дзяржавы,- горда заявіў на з"ездзе А.М.Горкі, - дзе навука і літаратура карысталіся-б такой таварыскай дапамогай, такімі клопатамі аб павышэнні прафесіянальнай кваліфікацыі работнікаў мастацтва і навукі" як гэта "ў краіне, дзе няўтомна і цудадзейна працуе жалезная воля Іосіфа Сталіна".

"За работу, таварышы, - гэта быў заклік Максіма Горкага да пісьменнікаў, - дружна, шчыра, страсна за работу!"

У кожнага пісьменніка з"езд нарадзіў вялікай сілы хвалю крытычных думак і прагнасць узяць новыя вышыні, імкненне яшчэ бліжэй стаць да перамог эпохі.

Гэта з"яўляецца вялікай творчай атмасферай - атмасферай новых мысляў, новага жадання да пазнання, да прадукцыйнай творчай працы. Гэта атмасфера, якая немінуча народзіць новыя справы, якія канкрэтна будуць выражаны ў творах новай ідэйна-мастацкай якасці.

Аднак, каб творчыя стымулы , народжаныя з"ездам, пера-тварыць у рэальную дзею, каб падтрымаць і безупынна развіваць хвалю творчай актыўнасці, каб яшчэ больш узняць пачуццё ад-казнасці за работу пісьменніка, каб выхоўваць новыя кадры літаратуры, патрэбна вялікая калектыўная праца пісьменніцкай арганізацыі.

Работу Саюза Савецкіх пісьменнікаў Беларусі трэба нала-дзіць так, каб штодзённа, сістэматычна дапамагаць пісьменніку пашыраць сваю культуру, заваёўваць вышыні навукі і тэхнікі, узбройвацца філасофіяй марксізма-ленінізма, глыбей стаць да жыцця.

Без цеснай і непарыўнай сувязі пісьменнікаў з шырокімі працоўнымі масамі, з народам нашай краіны, з яго жыццём і барацьбой, без дапамогі новым пісьменнікам з няроду, няма і не можа быць руху літаратуры наперад.

Сярод працоўных мас пісьменнік набывае істотнае веданне жыцця, велізарны вопыт, які неабходны яму, як выхаваўцу людзей нашага часу ў духу камунізма. Памножаны на філасофскую сталасць мыслі і веданне гісторыі чалавечай культуры, гэты вопыт ар-ганічнай сувязі з масамі становіцца той скарбніцай, з якой пісьменнік бярэ ідэі і вобразы і сілай свайго таланта стварае/ творы - мастацкія помнікі сваёй вялікай, слаўнай эпохі.

"Звязда", 1934, 18-IX, № 209, с.2.